

ДОБРЫ ВЕЧАР

Добрый вечер

МІНСКАЯ ГАРАДСКАЯ ГАЗЕТА

1993 МАЙ 18 АЎТОРАК

№ 91 (526)

Цана 5 рублёў



СТАЛІЧНАЯ ХРОНІКА

ПА ПАВЕДАМЛЕННЯХ БЕЛАПАН, РІД, БЕЛ ІНФАРМ І ЎЛАСНЫХ КАРЭСПАНДЭНТАЎ «ДВ»

☐ ЭХО СОБЫТИЯ

ПРИНЯТА РЕЗОЛЮЦИЯ

В РАМКАХ «Всеевропейской недели борьбы инвалидов за равные права и против дискриминации» в Минске прошел День протеста инвалидов. На состоявшемся по этому случаю митинге была принята резолюция, которую его участники направили председателю Мингорсовета А.М.Герасименко.

Еще в январе этого года, говорится в резолюции, в горсовете состоялась встреча представителей общественных организаций инвалидов с руководством горисполкома и его структурных подразделений. Тогда властям было передано много письменных просьб и пожеланий от общественных организаций и от отдельных инвалидов. Их исполком взялся обобщить и принять соответствующее постановление, направленное на улучшение жизни инвалидов за счет средств городского бюджета. Однако до сих пор этого не сделано.

Участники митинга потребовали от Мингорисполкома незамедлительно приступить к реализации своего права принимать самостоятельно решения в соответствии со статьей 48 Закона Республики Беларусь «О социальной защите инвалидов в Республике Беларусь» и до 1 сентября 1993 г. принять согласованное с Минским городским правлением БелОИ и депутатской комиссией по делам инвалидов Мингорсовета развернутое постановление «О неотложных мерах по социальной защите и реабилитации инвалидов в г.Минске».

Мы надеемся, говорится в резолюции, что наше требование будет услышано и правильно понято руководством города. В противном случае акция протеста повторится и ей будут приданы другие, более действенные формы.



ГЭТЫЯ юныя артысты прымалі ўдзел у вялікай канцэртнай праграме, якая паклала пачатак першаму Усебеларускаму фестывалю юных талентаў і дараванняў пад назвай «Усе мы родам з дзяцінства». Яго праводзіць фонд сацыяльнай падтрымкі дзяцей і падлеткаў «Мы — дзецям».

НА ЗДЫМКУ: выступаюць юныя артысты ансамбля «Бусляняты» пад кіраўніцтвам кампазітара Дзмітрыя Еўтуховіча.

☐ ЭТО — ФАКТ

ПРАЗДНИКОВ ДОБАВИТСЯ

В белорусском календаре может появиться еще один «красный» день. На это надеются белорусские бизнесмены. Они внесли в Верховный Совет республики предложение считать 15 июня Днем предпринимателей Беларуси.

— В этот день два года назад был образован республиканский Союз предпринимателей, — пояснил президент Союза Владимир Карягин. — Вокруг него смогли объединиться наиболее деловые и предприимчивые люди, которые по-своему решили лечить больную экономику и бороться с грозящей безработицей.

За два года бизнесмены создали около 750 тысяч новых рабочих мест. Для республики с 10-миллионным населением это не так уж и мало.

ЕСТЬ ЧЕМ ГОРДИТЬСЯ МОТОРНОМУ

Анатолий РОМАНОВИЧ.

В наше тяжелое для производственников время столичный моторный завод выделяется среди других предприятий своими высокими и стабильными показателями. Это особенно приятно отметить накануне 30-летнего юбилея моторного. В беседе с корреспондентом РИДа главный экономист завода И.А.Амельянович сказал:

— В то время, как многие заводы находятся на грани остановки, наш моторный за 4 месяца этого года дал прирост продукции на 17 процентов. Регионы, куда сегодня идут двигатели с предприятия, — Узбекистан, Россия, Украина, Литва, Молдова и другие республики бывшего Союза.

☐ КОРОТКО

Национально-демократическая партия Беларуси получит на днях ключи от собственной штаб-квартиры.

По уточнению заместителя председателя этой партии Виктора Науменко, местом встреч и работы национал-демократов станет трехкомнатная квартира в районе Партизанского проспекта.

☐ АКТУАЛЬНО

ПРОЕЗД ДОРОЖАЕТ

Вчера мы сообщили о новых тарифах на проезд в городском транспорте, а сейчас дополнительная информация. Стоимость проездных билетов будет таковой:

(1) — Для населения, предприятий, организаций и учреждений; (2) — Для учащихся дневных школ и ПТУ; (3) — Для студентов дневных отделений вузов и техникумов.

	(1)	(2)	(3)
на один вид транспорта	550	150	250
автобус-экспресс городской	1100	300	500
на два вида транспорта	700	250	300
на три вида	1000	500	650

Повышение платы за проезд связано с тем, что с 15 апреля по постановлению Совета Министров топливо для городского транспорта отпускается не по фиксированным, а по свободным ценам. При стоимости проезда в 5 рублей потребуется дотация в 19 млн. рублей для городского транспорта и 1,54 млрд. руб. — для пригородного. В связи с нехваткой бюджетных средств горисполком принял решение о новых тарифах за проезд.

«БОГ — МОЙ СЯБРА» —

так называется выставка детских рисунков, открывшаяся в Литературном музее Максима Богдановича. Совместно с его сотрудниками экспозицию организовали Белорусская католическая громада и парафия костела Святой Троицы на Золотой Горке.

Выставку без преувеличения можно назвать уникальной. Свои работы представили ребята со всей Беларуси. Юным художникам в возрасте до 14 лет предложили пофантазировать на библейские темы. Из четырехсот рисунков жюри отобрало лучшие, определило победителей. Сама же выставка вместила около двухсот детских иллюстраций к Священному Писанию.

Судя по изображениям, самое яркое впечатление после знакомства с Книгой книг у ребят оставили описания всемирного потопа и распятия Христа. Впрочем, некоторые из них взялись запечатлеть сюжеты, памятные разве что знатокам. Одна девочка, например, представила «Святую Теклу с львами». Что ж, по крайней мере, это лучше, чем война, которую так любили рисовать дети предыдущих поколений.

Выставка продлится до конца мая. Воспользуйтесь случаем, загляните еще раз в Троицкое предместье — к Максиму. Здесь вы всегда обретете гармонию.

НОВАЯ ТЕХНИКА ДЛЯ СЕЛЬЧАН

В поселке Привольном Минского района, на Западной МИС, готовится к открытию выставка образцов новой сельскохозяйственной техники.

В выставке примут участие предприятия Госкомпрода республики, которые представят на суд соответствующих специалистов из Минсельхозпрода, а также потенциальных покупателей в лице руководителей хозяйств различные сельскохозяйственные машины, агрегаты, разного рода технические приспособления, новые технологии. Ожидается, что после выставки состоится распродажа образцов.

☐ НАВІНЫ КУЛЬТУРЫ

ОПЕРА — ДЗЕЦЯМ

ІРЫНА ГЕРМАНОВІЧ, пазаштатны карэспандэнт «ДВ».

На сцэнах Мінска з вялікім поспехам ідзе першая беларуская дзіцячая опера «Пра тое, што было», якую стварыў кампазітар Эдуард Казачкоў на лібрэта Васіля Жуковіча. Гэты творчы дуэт даўно і плённа працуе, але самым арыгінальным творам стаў, бадай, менавіта гэты.

Выканаўцы оперы — дзеці, вучні сярэдняй школы № 1. І гэта не дзіўна, бо опера напісана спецыяльна для дзяцей. Казка, якая пакладзена ў яе аснову, інтрыгуе і дазваляе дзеткам лягчэй далучацца да складанага жанру мастацтва. Як падкрэсліў сам Э.Казачкоў, ён стварыў оперу для таго, каб ужо з самага малодшага ўзросту дзеці прывучаліся да ўспрыняцця мастацтва, вартасць якога можа ацаніць нават не ўсялякі дарослы. Наогул, лічыць кампазітар, далучэнне дзіцяці з ранняга ўзросту да музыкі, асабліва класічнай, адыграе вялікую ролю ў фарміраванні асобы — развіваецца добры музычны густ і слых, а гэта дае разуменне прыгажосці гукаў і жыцця.

СПРАВАЗДАЧА АБ РАБОЦЕ ВЫКАНКАМА ГАРСАВЕТА

З даклада старшыні Мінскага гарадскога Савета народных дэпутатаў А.М.Герасіменкі на XII сесіі гарсавета XXI склікання 11 мая 1993 года

Работа выканкама Мінскага гарадскога Савета ў 1992 і бягучым годзе праходзіла і праходзіць ва ўмовах далейшага пераводу эканомікі на рыначныя рэйкі, у дастаткова складаных грамадска-палітычных абставінах. Перыяды паляпшэння змяняюцца нарастаннем новых цяжкасцей. Тым не менш патрэбна адзначыць, што ўваходжанне эканомікі горада ў рынак набыло незваротны характар. Але гэтыя працэсы працякаюць на фоне нестабільнай работы многіх прадпрыемстваў прамысловасці, транспарту і іншых галін народнай гаспадаркі, зніжэння жыццёвага ўзроўню насельніцтва, ва ўмовах імклівага росту цэн і тарыфаў на тавары і паслугі. Прычым гэтыя тэндэнцыі, на жаль, ідуць з нарастаннем.

У справаздачны перыяд галоўнымі напрамкамі работы выканкама былі падтрымка і перабудова эканомікі горада непасрэдна для патрэб людзей, правядзення канверсіі ваенна-прамысловага комплексу. Забеспячэнне сацыяльна-эканамічнага развіцця горада, выкананне бюджэту, пераход да рыначных адносін, правядзенне прыватызацыі і развіццё новых формаў гаспадарання, сацыяльная абарона розных пластоў насельніцтва праходзілі ва ўмовах росту цэн і беспрацоўя. Асаблівая ўвага ўдзялялася выкананню наказаў выбаршчыкаў, пытанням культуры, народнай адукацыі, аховы здароўя, усебаковаму ўкараненню ў жыццё беларускай мовы. Важным напрамкам было падтрыманне стабільнасці і парадку, задавальненне законных правоў грамадзян, пошук згоды і ўзаемаразумення паміж рознымі палітычнымі рухамі, партыямі ў інтарэсах жыхароў нашага горада.

У справаздачны перыяд праведзена 57 пасяджэнняў выканкама, на якіх разгледжана больш чым 1100 пытанняў. Часцей за ўсё абмяркоўваліся праблемы эканомікі, сацыяльнай абароны людзей, гандлю, харчавання, развіцця і ўтрымання гарадской гаспадаркі, добраўпарадкавання, аховы здароўя, адукацыі, культуры і г.д.

(Заканчэнне на 2-й і 3-й стар.)

● ПРЭЗЕНТАЦЫЯ

НА НЯМІЗЕ ЗНОЎ ГАНДЛЮЮЦЬ

ТАМАРА МАРКІНА.

Лёсам наканавана Нямізе быць гандлёвай вуліцай. Яшчэ ў XII стагоддзі сяляне і рамеснікі тут прадавалі свой няхітры, створаны ўласнымі рукамі, скарб. І вось ў канцы мінулага тыдня тут адкрыўся адзін з самых вялікіх універмагаў Беларусі. Белыя сцягі з прыемнай воку назвай «Гандлёвы дом на Нямізе» клікалі мінчан і гасцей сталіцы. У адкрыцці прынялі ўдзел старшыня Мінгарвыканкама А.М.Герасіменка, міністр гандлю В.І.Байдак, прадстаўнік фірмы «Хартман» Ёрк Хартман. Спадар Хартман — непасрэдны ўдзельнік нараджэння гандлёвага дома — даччынай фірмы сумеснага беларуска-германскага прадпрыемства «Родэн Мінск». Ён зазначыў, што, нават па заходніх мерках, гэта гандлёвае прадпрыемства вельмі вялікае. Значнай з'явай у жыцці горада назваў адкрыццё гэтага магазіна А.М.Герасіменка. В.І.Байдак ацаніў яшчэ вышэй — назваў падзеяю гістарычнай.

Свята было цікавым. Святкуючых добрай песняй павіншавалі зоркі беларускай эстрады Я.Паплаўская і А.Ціхановіч.

У добры шлях, «Гандлёвы дом на Нямізе».



«Я БЫ В ЛЕТЧИКИ ПОШЕЛ...»

Минский авиатехнический колледж — одно из немногих учебных заведений республики, которое устояло перед натиском безработицы. Его спасает то, что предлагаемые здесь специальности применимы не только в гражданской авиации, но и во многих отраслях народного хозяйства. Охотно принимает, например, выпускников колледжа минское ПО «Интеграл».

Новым в обучении курсантов стало в последнее время то, что в колледже больше внимания теперь уделяют иностранным языкам, поскольку Беларусь осваивает международные авиалинии. С нынешнего года здесь готовят техников-механиков по эксплуатации воздушных судов и авиадвигателей.



НА СНИМКАХ: 1. Курсанты Дмитрий Хроленков (слева) и Александр Жук на занятиях в лаборатории информационных систем.

2. Заместитель начальника Минского авиатехнического колледжа по воспитательной работе Владимир Сергеевич Вронский (в центре) с курсантами на учебном аэродроме.

Фото Аркадия НИКОЛАЕВА.

МАЗ С ДЫМОМЕРОМ

Есть надежда, что столица Беларуси в какой-то мере значительно избавится от загазованности. В ближайшее время ни одна большегрузная дизельная машина семейства МАЗ, КамАЗ, КРАЗ не пройдет по городу с неисправным двигателем. На их пути встанет экологическая инспекция городской службы ГАИ. А помогут ей в этом оптические дымомеры ДО-1 со стрелочными индикаторами и индикаторы дымности ИД-1.

Приборы разработаны и поставлены на серийное производство на одном из заводов Минобороны бывшего СССР в Минске. Ими комплектует уже почти каждый МАЗ малое государственное предприятие «Корэкс» Белорусской научно-промышленной ассоциации. Так что у покупателей новых дизельных автомобилей белорусского производства проблем с экологической инспекцией не возникнет.

● ДОРОГА И ДЕТИ

ОТДЕЛАЛИСЬ УШИБАМИ

А.БАРАНОВСКИЙ, инспектор ГАИ,

С наступлением весны сотрудники ГАИ столицы фиксируют все больше случаев дорожно-транспортных происшествий с участием детей. Как правило, эти случаи происходят по вине самих детей. Зачастую они перебегают проезжую часть в неустановленных для пешеходов местах, в непосредственной близости перед транспортом.

Так, 24 апреля, около 10 утра, малолетние Борисовец Лена и ее брат Алексей, ученики 19 школы, были отпущены без присмотра своей мамой к бабушке. Приехав на трамвайную остановку «Проспект Скорины», они попытались перебежать улицу Козлова вне пешеходного перехода. В итоге и девочка, и мальчик попали под «Жигули», которыми управлял водитель Ю.Данилов.

По счастливой случайности дети отделались ушибами и ссадинами и были доставлены в приемное отделение одной из городских больниц.

По результатам разбора этого происшествия в возбуждении уголовного дела было отказано. В действиях водителя Данилова состава преступления не обнаружено.

Все обошлось благополучно. Однако так бывает не всегда. Зачастую дети получают куда более тяжелые травмы, а подчас и погибают.

Еще раз хочется напомнить о необходимости присмотра за детьми. Ведь их поведение на дороге бывает непредсказуемо. Важна помощь со стороны учителей, общественных организаций и просто людей, которые могут оказаться рядом и уберечь ребенка от грозящей опасности.

КАЛЯНДАР

Аўторак, 18 мая (траўня).

СОНЦА — 5.03/21.09

Даўжыня дня — 16.07

МЕСЯЦ — апошняя квадра 13 мая

усход 2.49/захад 15.59

ІМЯНІНЫ:

СЁННЯ:

Праваслаўныя: Ірыны, Якуба.

Каталіцкія: Аляксандры, Фэлікса, Эрыка, Яна.

ЗАЎТРА:

Праваслаўныя: Іова (Іава, Ёва), Міхея.

Каталіцкія: Івона, Міколы, Пятра



Свежие Новости Городов СНГ



САНКТ-ПЕТЕРБУРГ

Цены «тянут» друг друга

С 12 мая стоимость проезда в Санкт-Петербургском метро повысилась до 10 рублей. Как заявила администрация метрополитена, если прежде пассажир оплачивал 25 процентов стоимости своей поездки, то теперь он оплачивает 50 процентов. Эта мера автоматически повысила плату и за пользование городским таксофоном, так как значительная часть аппаратов уже переделана под прием жетонов метрополитена.

Эрмитаж судится

12 мая директор Эрмитажа Михаил Пиотровский вылетел в Париж, где должен состояться суд по иску графини Келлер, урожденной Щукиной. Она считает, что государство, национализировав коллекцию Сергея Щукина в 1917 году, не имело права делить ее между Эрмитажем и Московским музеем изобразительных искусств. Поэтому коллекция должна экспонироваться вместе.

Пиотровский считает, что российский музей выиграет этот процесс. Он также заметил, что потомки других бывших хозяев национализированных коллекций — Юсуповы, Строгановы, Шереметьевы — не предъявляли аналогичных претензий.

МОСКВА

«Липнут» доверчивые граждане

Новый вид надувательства с успехом стал обживаться в России в связи с обменом загранпаспортов. В последнее время в столице расплодилось множество коммерческих фирм, занимающихся выдачей липовых загранпаспортов. Доверчивые граждане, желая сэкономить время, платят большие деньги за услуги этих контор, которые обязуются оформить документ едва ли не за сутки. Однако на границе подделка так или иначе вскрывается.

ПО СООБЩЕНИЯМ БЕЛАПАН, РИД

20 мая ў штаб-кватэры БНФ (вул.Варвашэні, 8) адбудзецца канферэнцыя сяброў і прыхільнікаў БНФ «Адраджэнне» Савецкага раёна.

ПАЧАТАК РЭГІСТРАЦЫІ ў 18.30.

КРИМИНАЛ

С КЕМ ПОВЕДЕШЬСЯ...

Родная милиция часто обижается на неласковые прозвища, которыми награждают ее законопослушные и не очень граждане. Однако виноваты в этом порой сами работники правопорядка.

11 мая на Партизанском проспекте г.Минска на остановке общественного транспорта напротив ДК автозавода можно было наблюдать такую сцену. Двое развязных юнцов во все горло сквернословили, одаривая «сочными комплиментами» рядом стоящих. Для «эскалации» боевого духа один из хулиганов саданул ногой в подъехавший троллейбус и пожелал «всего хорошего» его водителю. Но самое удивительное, что находившийся рядом сержант милиции лишь от души посмеялся.

Кстати, на днях в этом же районе произошло зверское убийство. Знакомый автору милиционер делает все возможное, чтобы найти преступников. Ему и невдомек, что кто-то из его коллег может запросто сходить с одним из них «на пиво»...

ИЩУТ «ПРОКАТЧИКИ», ИЩЕТ МИЛИЦИЯ

В фирме проката «Отдых» подумывают о том, чтобы взять в штат сыщика.

По крайней мере так полушутя отреагировали работники одного из минских ателье проката, когда выяснилось, что они выдали телевизор мошеннику.

А началась эта история с того, что у одного молодого минчанина пропал паспорт. Пока документ восстанавливали, завладевший им злоумышленник успел совершить немало проступков. В частности, на имя владельца паспорта он взял напрокат телевизор, предварительно получив справку с места работы на бирже труда. Не исключено, что ему удалось «прокатить» где-нибудь и другую технику. Извечный вопрос «а кто платить будет?» пока решается не в пользу потерпевшего.



Рис. Л. Колодина.

СПРАВАЗДАЧА АБ РАБОЦЕ ВЫКАНКАМА ГАРСАВЕТА

(Працяг. Пачатак на 1-й стар.)

ЭКАНОМІКА

А цяпер аб канкрэтных выніках работы. І перш за ўсё ў эканоміцы горада.

Хоць крызісныя з'явы ахапілі ўсе сферы народнай гаспадаркі рэспублік былога Саюза, развіццё эканомікі Мінска застаецца на адносна стабільным узроўні. Нягледзячы на пэўны спад аб'ёмаў вытворчасці ў 1992 г., вынікі работы 4 месяцаў бягучага года абнадзейваюць. У рабоце прамысловасці горада прырост вытворчасці склаў 3,5%. На 3,9% павялічыўся выпуск тавараў народнага спажывання, прычым прырост адбыўся па ўсіх групах тавараў. Дастаткова высокімі тэмпамі ідзе канверсія прадпрыемстваў абароннага комплексу, дзе пры зніжэнні вытворчасці профільнай прадукцыі нарошчваецца выпуск складанай бытавой тэхнікі, раней увозімай з-за межаў рэспублікі.

З мэтай насычэння рынку таварамі народнага спажывання, асваення новых і павелічэння выпуску тавараў, што карыстаюцца павышаным попытам, распрацавана «Комплексная праграма развіцця вытворчасці тавараў народнага спажывання на 1992-1995 г г. у Мінску», па якой павелічэнне вытворчасці спажывецкіх тавараў прадугледжваецца дасягнуць за кошт канверсіі абаронных прадпрыемстваў, перапрафілявання і тэхпераўзбраення дзеючых прадпрыемстваў, уводу новых магутнасцей.

Адным з важных шляхоў насычэння рынку таварамі мы лічым развіццё кірмашовага руху. Толькі ў мінулым годзе выканкамам і Саюзам прадпрымальнікаў у горадзе было арганізавана 8 кірмашоў з удзелам 500 замежных і айчынных фірмаў. Тры кірмашы праведзены ў бягучым годзе. Сума здзелак на іх склала 17 млрд. рублёў, заключана 305 дагавораў.

Нягледзячы на цяжкасці, што маюцца сёння практычна ў кожным працоўным калектыве, мы заўсёды знаходзім падтрымку і разуменне з боку іх кіраўнікоў. Гэта я адзначаю з глыбокім задавальненнем і ўдзячнасцю. Вырашэнне многіх праблем горада ў значнай ступені залежыць ад таго, як хутка мы зможам прайсці пераходны да рынку перыяд.

На сучасны момант у горадзе зарэгістравана 5749 малых прадпрыемстваў, 24 канцэрны, 111 акцыянерных таварыстваў, 128 асацыяцый, 15 біржаў. На іх прыпадае 7% агульнагарадской вытворчасці тавараў народнага спажывання і аб'ёму аказваемых паслуг. Больш 40% патрэбнасцей гарадской гаспадаркі ў матэрыяльна-тэхнічных і сыравінных рэсурсах набыта праз біржы, аўкцыёны, кірмашы і па прамых сувязях. Праз камерцыйныя структуры горад атрымліваў алей, садавіну, агародніну, дзіцячае харчаванне, бульбу. У бягучым годзе камерцыйныя структуры прынялі актыўны ўдзел у добраўпарадкаванні горада пасля зімы.

Але рыначная сацыяльна арыентаваная эканоміка ў горадзе робіць толькі яшчэ першыя крокі. Нягледзячы на хуткі колькасны рост прадпрыемстваў недзяржаўных формаў уласнасці, пакуль што не адбылося якаснага напаўнення гэтага росту. Асноўная частка створаных структур займаецца гандлёва-пасрэдніцкімі аперацыямі і толькі лічаныя адзінкі — вытворчай і будаўнічай дзейнасцю.

Што з'яўляецца адной з прычын узнікнення гіперінфляцыі? На сённяшні дзень тэмпы росту грашовай масы абганяюць тэмпы росту выпуску прамысловай прадукцыі ў 366,8 раза. Камітэту эканомікі ў гэтай справе неабходна для нейтралізацыі «гарачых грошай» больш глыбока аналізаваць прычыны зніжэння вытворчасці і прыняць шэраг эфектыўных мер для прывядзення ў дзеянне рыначных механізмаў, зніжэння грашовай масы ў абароце шляхам стрымання крэдытнай эмісіі, а гэта значыць, што камерцыйныя банкі ў першачарговым парадку павінны напраўляць крэдытныя рэсурсы на вытворчасць тавараў народнага спажывання, прадуктаў харчавання, жыллёвае будаўніцтва. Думаю, што нам неабходна прадумаць механізм заахвочвання па ўтварэнню малых прадпрыемстваў, фірм, асацыяцый, якія непасрэдна займаюцца вытворчасцю, а па існуючых правесці інвентарызацыю іх дзейнасці.

ПРЫВАТЫЗАЦЫЯ

На сённяшні дзень у горадзе ўжо прыватызавана 55 аб'ектаў камунальнай уласнасці, у тым ліку — на конкурснай аснове. На рынак гарадскога фонду прыватызацыі паступіла 86,7 млн. руб.

На аснове прапаноў прадпрыемстваў і арганізацый, а таксама ўпраўленняў і аддзелаў гарвыканкама распрацавана праграма прыватызацыі на 1993 г., якой прадугледжана прыватызаваць 280 аб'ектаў камунальнай уласнасці. Пасля руплівай прапрацоўкі ў пастаянных камісіях, упраўленнях, райвыканкамах яна будзе ўнесена на зацвярджэнне гарадскога выканаўчага камітэта і сесіі Мінгарсавета.

Разам з тым неабходна адзначыць, што рознымі праверкамі ў горадзе выяўляецца шмат парушэнняў існуючых законаў па адчужэнню дзяржаўнай маёмасці. Лічым неабходным камітэту эканомікі, усім кантралюючым органам больш адказна і патрабавальна ставіцца да такіх фактаў, прымаць больш жорсткія меры па такіх парушэннях.

Ва ўмовах парушаных эканамічных сувязей, пераходу на ўзаемаразлікі па асноўных відах прадукцыі і сыравіны ў валюце асаблівае значэнне набывае знешнеэканамічная дзейнасць прадпрыемстваў і арганізацый.

У 1992 г. аб'ём **знешнегандлёвых аперацый** прадпрыемстваў і арганізацый г.Мінска склаў больш за 150 млн. долараў ЗША (у т.л. экспарт — 95 млн., імпарт — 55 млн. долараў ЗША).

Актывізавалася работа па прыцягненню замежнага капіталу ў эканоміку горада. Сёння ў Мінску зарэгістравана звыш 480 сумесных і 90 стопрацэнтных замежных прадпрыемстваў з удзелам замежных інвестыцый фірмаў 50 краін свету. Агульная сума айчынных і замежных капіталаў ва ўстаўныя фонды гэтых прадпрыемстваў склала 1540 млн.руб. і больш за 80 млн. долараў. На сумесных прадпрыемствах працуюць 5144 чалавекі. Аб'ём выпушчанай імі прадукцыі і аказаных паслуг перавысіў 2 млрд. 452 млн. руб.

У горадзе можна выдзеліць цэлы шэраг сумесных прадпрыемстваў, якія ўстойліва развіваюць уласную вытворчасць прадукцыі і паслуг.

Захоўваючы сфарміраваныя гандлёва-эканамічныя адносіны, выканкам развівае сувязі з партнёрамі іншых рэгіёнаў былога Саюза. Наш горад уступіў у асацыяцыю гарадоў — сталіц СНД. Мы ўпэўнены, што непасрэдныя міжгарадскія сувязі могуць кампенсаваць недахопы міжурадавых адносін у гэтым працэсе.

На ўзроўні муніцыпальных структур рыхтуюцца адпаведныя пагадненні з Масквой, Алма-Атой, Кіевам, Санкт-Пецярбургам, Калінінградам, Тулай, Тбілісі.

На адным з апошніх пасяджэнняў выканкама гарсавета зацверджана праграма знешнеэканамічнай дзейнасці. Яе ажыццяўленне будзе садзейнічаць прыцягненню замежных інвестыцый у розныя галіны народнай гаспадаркі.

ФІНАНСЫ

Адным з важнейшых пытанняў забеспячэння дзейнасці гарадской гаспадаркі з'яўляюцца фінансы.

Пры цяперашніх эканамічных умовах і няспынным росце цэн і тарыфаў пры інфляцыі бюджэт стаў адной з крыніц сродкаў, за дапамогай якога звяртаюцца не толькі бюджэтныя ўстановы, але і гаспадарчыя органы, што працуюць на прынцыпе самаакупнасці.

Гарсаветам і яго выканаўчым органам у апошнія два гады ўдзялялася значная ўвага ўмацаванню сваёй фінансавай базы — бюджэту горада, які зацвярджаўся з вялікімі цяжкасцямі і яшчэ ў больш складаных умовах выконваўся.

Асабліва вялікія цяжкасці ў пытаннях фінансавання стварае нестабільнасць цэн, разрыў сувязей паміж пастаўшчыкамі. Так, на 1 красавіка б.г. за адгружаную прадукцыю прадпрыемствы горада недаатрымалі больш за 55 млрд. рублёў супраць 38 млрд. рублёў па запазычанасці саміх.

Нягледзячы на тое, што ўжо не першы год гарадскі і раённыя бюджэты планаваліся і зацвярджаліся са значным дэфіцытам, у працэсе выканання выканкам дабіваўся іх збалансаванасці. Гэта з'явілася вынікам пастаяннай работы, накіраванай на прыцягненне дадатковых крыніц фінансавання і забеспячэнне больш жорсткага рэжыму эканоміі і беражлівасці ў расходванні сродкаў.

СПАЖЫВЕЦКІ РЫНАК

Нялёгкім будзе і бягучы год. У пытаннях выканання бюджэту выканкам паставіў перад сабой задачу, максімальна выкарыстоўваючы прадастаўленыя яму правы, з першых дзён праводзіць работу па забеспячэнню нармальнай дзейнасці жыццёва важных для горада галін.

Крызісныя з'явы ў вытворчасці адмоўна ўплываюць і на спажывецкі рынак. Гэтымі праблемамі займаецца ў горадзе камітэт рэгулявання рынку тавараў і паслуг.

Агульны аб'ём рознічнага тавараабароту ў 1992 г. у супастаўных цэнах знізіўся ў параўнанні з 1991 г. на 35,2 працэнта. У той жа час поўнасцю былі асвоены выдзеленыя фонды на мясапрадукты, маргарын, маянэз, цукар, чай, лікёра-гарэлачныя і кандытарскія вырабы. Насельніцтва горада адчувала цяжкасці ў набыцці абутку, трыкатажных вырабаў, баваўняных тканін. Таму намаганні падведамных камітэту службаў накіроўваліся на адшуканне рэсурсаў па дэцэнтралізаваных крыніцах. Усяго па дэцзакупу атрымана тавараў на 10,5 млрд.рублёў.

У бягучым годзе пытанне з забеспячэннем гараджан харчовымі прадуктамі стаіць не менш востра. За студзень-сакавік, напрыклад, выпрацоўка мяса ў сувязі з перабоямі паставак жывёлы скарацілася ў параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года на 24,8 працэнта, цэльнамалочнай прадукцыі ў пераліку на малако — на 16,5 працэнта, масла жывёльнага — на 84,1 працэнта.

Улічваючы сітуацыю, якая склалася, выканкам вымушаны захаваць на бягучы год талонную сістэму продажу некаторых прадуктаў харчавання. Больш таго, рэалізацыя віна-гарэлачных вырабаў, цукру, масла ажыццяўляецца па картках у магазінах, замацаваных за грамадзянамі.

Выхад можа быць і не самы лепшы, але іншага мы не бачым.

Апошнія дзве зімы горад у дастатковай меры забяспечваецца бульбай, плодагародніннай прадукцыяй. І ўжо зараз пачалася работа па заключэнню дагавораў і ўстанаўленню ўзаемавыгадных сувязей пад пастаўкі з ураджаю бягучага года.

Не лепшыя часы перажывае **служба быту**, аб'ём паслуг за мінулы год скараціўся на 30 працэнтаў, сетка якой паменшылася на 253 адзінкі. Тут ёсць аб'ектыўныя і суб'ектыўныя прычыны. Прадметная размова аб становішчы спраў, шляхах стабілізацыі адбылася на пасяджэнні выканкама гарсавета. Вызначаны меры дапамогі, зацверджана адпаведная праграма развіцця сферы паслуг на бліжэйшыя гады. Стаіць задача не дапусціць развалу гэтай, як аказалася, самай безабароннай гарадской службы.

Выканкамам гарсавета прыняты шэраг мер па вырашэнню эканамічных і арганізацыйных праблем **грамадскага харчавання** жыхароў горада. Створаны прадпасылкі па нармалізацыі фінансавага становішча і забеспячэнні стабільнай работы гэтай галіны. Адменены падатак на дабаўлены кошт для прадпрыемстваў харчгандлю (акрамя рэстаранаў, кафэ і бараў вышэйшай і І-й нацэначных катэгорый), вырашана пытанне кампенсацыі страт школьных сталовых і аднаразовага бясплатнага харчавання школьнікаў. З 1 снежня 1992 года па рашэнню X сесіі ўведзены бясплатныя экспрэс-снеданні для ўсіх школьнікаў.

На развіццё грамадскага харчавання горада толькі ў 1992 г. выкарыстана 192 млн. рублёў. Капітальна адрамантавана 17 прадпрыемстваў. У бягучым годзе плануецца забяспечыць асваенне капукладанняў за кошт уласных і бюджэтных сродкаў у аб'ёме 255 млн. рублёў.

У цяперашні час інстытутам «Белгіпрагандаль» распрацаваны прапановы па рэканструкцыі квартала ў межах вул.Энгельса, Кірава, Свярдлова, пр.Скарыны з перадачай памяшканняў у першых паверхах жылых і адміністрацыйных будынкаў пад аб'екты сацкультбыту з арганізацыяй гандлёвай вуліцы па вул.К.Маркса.

Акрамя таго, распрацавана «схема» развіцця і размяшчэння прадпрыемстваў грамадскага харчавання (агульнадаступная сетка) па г.Мінску на перыяд да 2000 года. Гэтымі дакументамі выканкам і кіруецца пры адводзе ўчасткаў пад будаўніцтва. Падабрана 50 месцаў для прадпрыемстваў хуткага абслугоўвання з лёгкіх металічных канструкцый. Прынята рашэнне Мінгарвыканкама аб размяшчэнні кіёскаў хуткага абслугоўвання.

БУДАЎНІЦТВА

Аб'ектам асаблівай ўвагі выканкама заўсёды было і застаецца **будаўніцтва.** Аб справах будаўнікоў гаворыцца нямала, з розных бакоў. У 1992 г. імі асвоена 18,4 млрд. рублёў капітальных укладанняў. Гэта больш, чым прадугледжвалася лімітам, але на трэць менш, чым у 1991 г. Засталося незавершаным будаўніцтва акушэрскага корпуса 6-й клінічнай бальніцы, дзіцячай палiклінікі ва Уруччы, кафэ і гастранома ў мікрараёне «Шабаны».

З канца мінулага года гэтую галіну курыруе першы намеснік старшыні гарвыканкама Ярмошын Уладзімір Васільевіч. Неабходна сказаць, што ён энергічна ўзяўся за новы ўчастак работы і, думаю, зможа паправіць справу.

Пытанне пытанняў — будаўніцтва жылля. На 1 студзеня 1993 г. стаяла на ўліку для паляпшэння жыллёвых умоў амаль 180 тысяч сем'яў.

У 1992 г. праз упраўленне капітальнага будаўніцтва гарвыканкама пабудавана 584 тысячы квадратных метраў жылля. Гэта некалькі ніжэй узроўню мінулых гадоў, але абвальнага скарачэння, што назіраецца ў іншых сталіцах, мы пазбеглі.

Выканкамам гарсавета распрацавана канцэпцыя жыллёвага будаўніцтва, па якой ставіцца задача павысіць колькасць будуемых кватэр, а таксама іх камфортнасць, больш шырока прыцягнуць да гэтай справы сродкі насельніцтва. Прадугледжваецца развіццё будаўніцтва малапавярховага жылля. Выпушчаны праекты цагляных жылых дамоў, у першых паверхах якіх прадугледжаны кватэры для інвалідаў, якія карыстаюцца крэсламі-калясамі. Распрацоўваюцца першыя дамы з аналагічнымі кватэрамі і ў індустрыяльных канструкцыях на базе буйнапанельнага домабудавання.

Вядзецца праектаванне паўназборных жылых блок-секцый розных серый з гаражамі-стаянкамі ў першых паверхах, а таксама праектуюцца аб'екты гандлю з прымяненнем лёгкіх металічных канструкцый, што дазволіць павысіць эстэтычныя якасці гэтых будынкаў, а таксама паскорыць іх узвядзенне.

Разам з тым, перад гарадскімі службамі стаіць шэраг сур'ёзных праблем, без вырашэння якіх у многім стрымліваецца развіццё горада у цэлым, яго сацыяльнай і інжынернай інфраструктур. У першую чаргу гэта датычыцца **адводу зямель для новага будаўніцтва.**

Папярэднія прапрацоўкі паказалі, што колькасць насельніцтва горада к 2010 г. узрасце да 2100 тысяч чалавек, а насельніцтва лесапаркавага пояса — да 200 тыс. чалавек. Для забеспячэння толькі жыллёва-грамадзянскага будаўніцтва гораду патрабуецца дадаткова 12,0 тыс. гектараў зямлі, у т.л. каля 6,0 тыс. гектараў для размяшчэння пасёлкаў індывідуальнай забудовы.

Ва ўмовах абмежаванасці гарадскіх тэрыторый далейшае развіццё горада можа быць забяспечана ў асноўным за кошт зямель Мінскага раёна. Але калі пэўнае ўзаемаразуменне і падтрымка Мінскага аблвыканкама ў частцы адводу зямель гораду маецца, то ўзгадненне гэтых пытанняў з землекарыстальнікамі звязана з велізарнымі цяжкасцямі. Так, напрыклад, без згоды горада ў апошні час на тэрыторыях, якія прылягаюць непасрэдна да яго, Мінскім райвыканкамам было выдзелена напрамую арганізацыям і прыватным асобам каля 1200-1400 га земляў.

У цяперашні час камітэтам па архітэктуры і інстытутам «Мінскпраект» разам з Дзяржбудам распрацавана канцэпцыя тэрытарыяльнага развіцця г.Мінска і абгрунтаванне новай гарадской мяжы. Матэрыялы ў бліжэйшы час будуць прадстаўлены на разгляд і зацвярджэнне ў Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь, а 14 мая па нашай ініцыятыве гэтае пытанне будзе разгледжана т.Шушкевічам С.С.

Адначасова інстытутам «Мінскпраект» падрыхтавана схема размяшчэння пасёлкаў індывідуальнага будаўніцтва.

Улічваючы тое, што пытанне выдзялення земляў для такога віду будаўніцтва зайшло ў «тупік», створаны Каардынацыйны савет, у склад якога ўвайшлі прадстаўнікі ўсіх зацікаўленых бакоў (аблвыканкама, гарвыканкама, Мінскага раёна).

За апошні час справа зрушылася з мёртвай кропкі. Мы атрымалі прынцыповую згоду на адвод шэрагу зямельных масіваў, у т.л. і вайсковага ведамства, агледзелі іх. У бліжэйшы час можна будзе асвойваць выдзеленыя ўчасткі. Выдзелена таксама каля горада 96 га зямлі ў межах гарадской мяжы пад агароды.

У складаным становішчы знаходзіцца **жыллёвая гаспадарка, энергетыка** горада. Новаму старшыні камітэта і члену выканкама Белахвоставу Уладзіміру Максімавічу ёсць над чым працаваць.

Што ўдалося і не ўдалося забяспечыць у 1992 г.? Прывяду некаторыя паказчыкі. Затраты на ўтрыманне жылога фонду склалі 1087 млн.рублёў, у т.л. па капрамонту — 580,8 млн.рублёў, што дало магчымасць выканаць вытворчыя паказчыкі як па бягучаму ўтрыманню, так і па капітальнаму рамонту жылога фонду. Уведзена пасля капрамонту 258,6 тыс. метраў квадратных карыснай плошчы. Але пры гэтым страты па жыллёвай гаспадарцы склалі 868,4 млн. рублёў.

Нягледзячы на тое, што ў цэлым фінансаванне, утрыманне і захаванасць жыллёвага фонду забяспечаны, пераломы да беражлівых адносін да яго з боку насельніцтва не наступіла.

Устойлівы рост затрат камунальных арганізацый пры адносным замарожванні тарыфаў па плацяжах насельніцтва захоўваецца і ў 1993 г. Неабходна будзе з бюджэту 4485 млн. рублёў (868 — 1992 г.).

Таму ў 1993 годзе мы вымушаны будзем адпрацаваць сістэму адпаведнага павышэння цэн на ўсе камунальныя паслугі.

У сувязі з гэтым некалькі слоў аб мэтах і задачах прыватызацыі жылля. Думаецца, праводзімая прыватызацыя жылля не вырашыць праблем фінансавання. Мэта прыватызацыі — перайсці да новых адносін з кватэранаймальнікамі ва ўмовах рынку. Па стану на 1 лютага 1993 г. прыватызавана 9563 кватэры, налічана жыллёвай квоты 158, 9 млн. рублёў. Перадача кватэр у індывідуальную ўласнасць дапаможа выхаваць у насельніцтва беражлівыя адносіны да жылля і эканомнае расходаванне вады, цяпла і энергарэсурсаў.

Гаворачы аб прыватызацыі, нельга не сказаць аб тым, што вяртанне кватэр так званага паўторнага засялення ў апошні час стала рэдкасцю. А вось выпадкі ўладання адной сям'ёй дзвюма і трыма кватэрамі ўжо не рэдкасць. Па выніках першага паўгоддзя 1993 г. мы выйдзем з прапановай у Вярхоўны Савет па ўдасканаленню жыллёвага заканадаўства.

Яшчэ адна сфера дзейнасці выканкама і камітэта — **энергазабеспячэнне горада.**

З аднаго боку, абвастраецца дэфіцыт цеплавой і электрычнай энергіі з-за недахопу магутнасцей, якія іх выпрацоўваюць. Выканкам тройчы разглядаў гэта пытанне на сваіх пасяджэннях.

Пастаянна кантраляваліся работы, якія звязаны з уводам новых магутнасцей на ЦЭЦ і заменай зношаных сетак, падрыхтоўкай ацяплення дамоў. Уведзены ў строй 6-ы энергаблок ЦЭЦ-4. З яго уводам цеплавыя магутнасці горада павялічыліся на 330 г.кал.гадз., а электрычныя — на 250 МВт. Дзякуючы гэтаму пакрываюцца патрэбнасці хутка растучай паўднёва-заходняй часткі горада.

Уведзена ў строй вытворчая база прадпрыемства «Мінсккамунцепласетка». Пастаянна на кантролі знаходзяцца работы па замене важнейшых цепламагістралей, якія адслужылі тэрміны службы і патрабуюць рэканструкцыі, у Цэнтральным, Заводскім, Фрунзенскім і Першамайскім раёнах горада. Усяго заменена 31 км. Нямала — у параўнанні з 1991 г.

У 1992 г. выканкам неаднаразова мяняў тарыфы на цеплавую і электрычную энергію ў бок павелічэння. Да гэтага прымушала эканамічная сітуацыя. Але трэба адзначыць, што пакуль удавалася льгатаваць камунальныя прадпрыемствы, установы аховы здароўя, адукацыі, культуры.

У справе забеспячэння **палівам і прыродным газам** збояў не было і дзякуючы своечасова праведзеным дадатковым закупкам па бартэру.

Падводзячы вынік сказанаму па энергазабеспячэнню горада, неабходна заўважыць, што праблемы тут нарастаюць. Мінск патрабуе асобага разгляду іх на дзяржаўным узроўні. Настаў час разгледзець пытанні энергазабеспячэння горада на сесіі гарсавета. Падрыхтоўкай гэтага пытання займаецца камісія, якую ўзначальвае Лапунін Альберт Паўлавіч.

Прадметам вялікага клопату выканкама з'яўляецца **камунальная гаспадарка** горада, транспарт і сувязь. Нягледзячы на ўсе цяжкасці, нам удалося захаваць адносна бесперабойную работу камунальнай, дарожна-будаўнічай і транспартнай інфраструктур горада.

У 1992 г. на аб'екты камунальнай гаспадаркі было накіравана больш 2,8 млрд. руб. капітальных укладанняў, у тым ліку 0,5 млрд. руб. на гарадскія ачышчальныя збудаванні. Укладзены і адрамантаваны сеткі водазабеспячэння і каналізацыі ў раёне п.Сцяпянка, Дворышча, вул. Сабінава, Талаша, Другога Наклоннага завулка, у прамвузле «Калядзічы». Праведзены мерапрыемствы па скарачэнню спажывання піццявой вады для вытворчых мэт. Завершаны пускавы комплекс водазабора «Зялёны Бор» магутнасцю 30,0 тыс. кубаметраў у суткі, што дазволіла палепшыць водазабеспячэнне паўночна-усходняй часткі горада.

Разам з тым, з-за абмежаванага выдзялення капукладанняў не поўнасцю задавальняюцца патрэбнасці насельніцтва ў пракладцы сетак у дамах індывідуальнай забудовы, правядзення работ па паляпшэнню санітарнага стану р.Свіслач і воднаму добраўпарадкаванню горада.

У 1992 годзе значна павялічыла аб'ём работ па **капітальнаму рамонту** вуліц дарожная служба горада. Для гэтых мэт з гарадскога бюджэту было накіравана 169 млн. рублёў, што дазволіла капітальна адрамантаваць 64 вуліцы, сярод якіх цэнтральныя магістралі пр.Ф.Скарыны і Машэрава, вуліцы Няміга, Свярдлова. Гэта работа яшчэ ў большых аб'ёмах будзе працягнута і ў гэтым годзе. Распрацавана і зацверджана рашэннем гарвыканкама праграма добраўпарадкавання і капітальнага рамонту дарожнай і зялёнай гаспадаркі на бліжэйшыя два гады.

Прыняты кардынальныя меры па паляпшэнню становішча на пракладцы інжынерных сетак пад метро. Пройдзена 80% тунеляў на працягу другой лініі ад станцыі «Фрунзенская» да станцыі «Пушкінская» і ад станцыі «Трактарны завод» да «Аўтазаводскай». Тут узводзяцца асноўныя будаўнічыя канструкцыі.

З найвялікшымі цяжкасцямі ў фінансаванні прыйдзецца пускаць гэтыя ўчасткі адпаведна ў 1994 і 1995 гадах. Для дапамогі ў гэтым, па дамоўленасці з прэм'ер-міністрам рэспублікі В.Ф.Кебічам, намі рыхтуецца пастанова Савета Міністраў.

У агульным пераліку праблем гарадскога жыцця найбольш востра паўстае **праблема транспарту.** Ва ўмовах росту цэн на сыравіну, матэрыялы, паліва рухомы састаў гарадскі пасажырскі транспарт аказаўся ў вельмі складаным становішчы. Больш паловы гарадскіх аўтобусаў, значная частка тралейбусаў і трамваяў патрабуюць спісання. На працягу апошніх трох гадоў з-за адсутнасці фінансавых сродкаў фактычна спынена набыццё аўтобусаў. За перыяд з 1990 года па 1992 год мы купілі толькі 4 новыя «Ікарусы» і 20 «ЛіАЗаў». У бягучым годзе толькі для замены саставу, які падлягае спісанню, неабходна набыць 420 аўтобусаў, 150 тралейбусаў і 22 трамваі. Для гэтага патрэбна 16 млрд. рублёў. А калі ўлічыць, што яшчэ 5 млрд. рублёў неабходна для будаўніцтва і рэканструкцыі аб'ектаў транспарту, то гэта сума ўзрастае да 21 млрд. рублёў. Магчымасці ж гарадскога бюджэту абмежаваны: усяго 2,5 млрд. рублёў на гэтыя патрэбы. Таму выхад з такога становішча бачым у стварэнні ў горадзе пазабюджэтнага транспартнага фонду, які неабходна фарміраваць за кошт адлічэння прадпрыемстваў і арганізацый у працэнтах ад фактычнага фонду аплаты працы. Праект пастановы аб стварэнні такога фонду сумесна з Міністэрствам транспарту і камунікацый унесены ў Вярхоўны Савет.

Адначасова павінен адзначыць, што ў горадзе і ў рэспубліцы пачата работа па асваенню выпуску свайго рухомага транспарту. На «Белрэмкамунмашы» асвойваюцца тралейбусы — ужо першыя ўзоры іх ходзяць па горадзе, і ў 1995 годзе плануецца выпусціць 250 адзінак. На аўтазаводзе сумесна з германскай фірмай «Неаплан» спраектаваны і пачынаецца выпуск айчыннага камфартабельнага аўтобуса.

АБ СУВЯЗІ

Нягледзячы на складанасці з набыццём абсталявання для тэлефонных станцый, кабельнай прадукцыі, а таксама іх высокага кошту ў г.Мінску ў мінулым годзе была ўведзена ў дзеянне АТС на 10,0 тыс. нумароў у мікрараёне «Вяснянка», пабудавана вынасная АТС на 1,0 тыс. нумароў у мікрараёне «Шабаны». Гэта дало магчымасць за мінулы год задаволіць каля 15 тыс. заяў ад грамадзян і 3500 ад прадпрыемстваў і ўстаноў.

У кардынальным плане зараз у камітэце ідзе работа па прыцягненню крэдытаў па рэалізацыі затрат і рэсурсаў, развіццю існуючых вытворчасцей. Пераглядаецца праграма будаўніцтва ў горадзе на прадмет вызначэння прыярытэтнасці і стварэння рэжыму найбольшага спрыяння для сектара жыццезабеспячэння горада.

З кожным днём пашыраецца кола задач і праблем камітэта аховы здароўя і сацыяльнай абароны насельніцтва.

АХОВА ЗДАРОЎЯ

Негатыўныя з'явы, якія адбываюцца ў сацыяльнай, эканамічнай і экалагічнай сферах горада, не маглі не адбіцца на здароўі.

І ўсё ж такі ў гэтых складаных умовах была забяспечана адносна ўстойлівая праца ўстаноў аховы здароўя. Усе калектывы лячэбна-прафілактычных устаноў функцыяніравалі без сур'ёзных зрываў і ў цэлым забяспечвалі насельніцтва меддапамогай на ўсіх этапах у поўнай меры і бездакорна.

Умацавана дыягнастычная база. На самастойны баланс выдзелена 9 лячпрафустаноў. Арганізаваны новыя цэнтры спецыялізаванай дапамогі, пашырана сетка дзённых стацыянараў, аддзяленняў аднаўленчага лячэння.

Праведзены значны аб'ём работ па медыцынскаму забеспячэнню насельніцтва, якое пацярпела ад аварыі на ЧАЭС і было перасялена ў г.Мінск з забруджаных раёнаў.

Працягвалася набыццё і ўкараненне вылічальнай тэхнікі ў лячэбна-прафілактычныя ўстановы горада.

Значна пашырылася матэрыяльная база аховы здароўя. На новым будаўніцтве асвоена 390 млн. рублёў. Уведзены ў эксплуатацыю паліклініка на 850 наведванняў у змену па вул.Стаханаўскай, 2-гі супрацьтуберкулёзны дыспансер на 400 наведванняў у змену, дыягнастычная паліклініка пры 1-ай клінічнай бальніцы, 13-ая, 18-ая дзіцячыя паліклінікі, Дом дзіцяці № 2, адкрыты дзіцячы хірургічны цэнтр 1-ай клінічнай бальніцы і іншае. У мінулым годзе працягвалася будаўніцтва дзіцячай стаматалагічнай паліклінікі на 320 наведванняў у змену.

На капітальны рамонт у 1992 годзе асвоена 110 млн. рублёў. У натуральным выражэнні адрамантавана бальніц на 240 ложкаў пры плане 200 ложкаў, паліклінік на 700 наведванняў у змену.

У мэтах памяншэння дзеяння радыяцыйнага, таксічнага і хімічнага фактараў знешняга асяроддзя сярод дзіцячага насельніцтва горада праведзена вітамінізацыя, на што затрачана больш 700 тыс. рублёў з пазабюджэтнага фонду выканкама гарсавета.

За кошт сродкаў цэнтралізаванага фонду было набыта медыкаментаў на адзін млн. дол. Выкарыстоўваліся бартэрныя адносіны, заключэнні прамых дагавораў з замежнымі фірмамі. Добрай падтрымкай была гуманітарная дапамога, яе аказалася на суму 156 млн. рублёў.

Асобныя лячэбныя прафустановы атрымалі дапамогу прадпрыемстваў і камерцыйных структур на 15 млн. рублёў. Выканкамам гарсавета, яго камітэтам па ахове здароўя вядзецца работа па стварэнню свайго гарадскога аптэчнага падраздзялення, па стварэнню гарадской фарміндустрыі, вядуцца перамовы з замежнымі фірмамі аб пастаўках лекаў і тэхналогій па іх вытворчасці.

У цэлым выканкамам гарсавета ўдзяляецца значная ўвага пытанням аховы здароўя. У 1992 г. на ўтрыманне ўстаноў аховы здароўя выдзелена з бюджэту 4,2 млрд. руб. Але прымаемых мер было недастаткова, бо паказчыкі здароўя па гораду пагоршыліся, таму камітэту Зелянкевіча неабходна глыбей аналізаваць прычыны іх росту і актыўней весці пошук паляпшэння работы па ахове здароўя грамадзян.

Ва ўмовах пераходнага, складанага перыяду нас не можа не хваляваць лёс нашага старэйшага пакалення. Для некаторых з іх сацыяльная абарона, дабрачыннасць — пытанне жыцця. Да канца 1992 г. лік атрымальнікаў пенсій і дапамог склаў 260 тысяч чалвек, з іх 37 тысяч — інваліды.

Адзначаючы становішча інвалідаў, ветэранаў, адзінокіх састарэлых грамадзян, мы зацвердзілі «праграму сацыяльнай абароны малазабяспечаных пластоў насельніцтва горада Мінска пры пераходзе да рыначных адносін». У ёй распрацаваны канкрэтныя меры, накіраваныя на падтрыманне пенсіянераў і інвалідаў, стварэнне пры выканкамах мэтавых фондаў сацыяльнай абароны.

На працягу 1992 г. такія фонды былі створаны ва ўсіх раёнах горада, праведзена работа па збору грашовых сродкаў, што дазволіла, нягледзячы на шматразовае падаражанне прадуктаў харчавання, транспартных паслуг, арганізаваць бясплатнае харчаванне для маламаёмных. Сягоння гэтай дабрачыннай акцыяй ахоплена больш за тысячу чалавек, 283-ом дастаўка гарачых абедаў ажыццяўляецца на дом.

За кошт сродкаў, што паступілі на дабрачынны рахунак горада, закуплена для пенсіянераў і інвалідаў прамысловых тавараў на суму каля 3-х млн. рублёў, на 1 млн. рублёў укамплектаваны і выдзелены сем'ям загінуўшых воінаў харчовыя пасылкі, 1,5 млн. руб. выдзелена на нарыхтоўку бульбы для адзінокіх грамадзян, якія знаходзяцца на абслугоўванні аддзяленняў сацыяльнай дапамогі. Апрача гэтага, аказана грашовай дапамогі больш чым на 2 млн. рублёў, 78 млн. руб. выдзяляецца на ўтрыманне дамоў-інтэрнатаў.

У горадзе адкрыта 10 секцый у магазінах, дзе можна набыць адзенне, абутак і іншыя тавары па папярэдніх заказах пенсіянераў і інвалідаў па найбольш нізкіх цэнах. У канцы мінулага года ў мікрараёне «Серабранка» справіў наваселле пабудаваны за кошт бюджэтных асігнаванняў жылы дом для ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны на 185 кватэр. Для паляпшэння пенсіённага абслугоўвання арганізавана дастаўка пенсій на дом.

У 1992 г. на ўсе віды сацыяльнай дапамогі было зрасходавана 5 млрд. 224 тысячы рублёў. Чатыры разы за год быў праведзены масавы пералік пенсій. Ход рэалізацыі пенсіённай рэформы знаходзіўся пад кантролем, і ў ліпені 1992 г. быў разгледжаны на пасяджэнні выканкама гарсавета.

Зразумела, што забяспечыць належны ўзровень дапамогі маламаёмным грамадзянам толькі сваімі сіламі выканкамы гар- і райсаветаў сёння не ў стане. Хочацца спадзявацца, што нашы прадпрыемствы і арганізацыі не застануцца збоку ад гэтай справы.

Прыклады такога ўдзелу прадпрыемстваў маюцца. Так, на аўтамабільным заводзе завяршаецца будаўніцтва дома для ветэранаў завода, кожнаму з заводскіх пенсіянераў з разліку за кожны адпрацаваны на прадпрыемстве год штомесячна выплачваецца надбаўка да пенсіі ў памеры 100 рублёў. Думаю, што вопыт аўтазавода ў горадзе павінен быць распаўсюджаны ў працоўных калектывах. Гуманнасць і цывілізаванасць любога грамадства павінна ацэньвацца праз адносіны да людзей старэйшага ўзросту, і наша задача — узяць гэта за правіла як у органах улады, так і ва ўсіх працоўных калектывах. У выканкаме ўзята за правіла праводзіць рэгулярныя сустрэчы з рознымі катэгорыямі інвалідаў, ветэранаў, іншых сацыяльна слаба абароненых пластоў насельніцтва з мэтай зняць іх праблемы і аператыўна іх вырашыць. Толькі ў 1992 г. прынята больш чым 20 рашэнняў выканкама, накіраваных на матэрыяльную падтрымку гэтых катэгорый насельніцтва.

Значную ўвагу выканкам, камітэт удзяляюць сацыяльнай абароне працаздольнага насельніцтва, якое па тых ці іншых прычынах часова апынулася без справы. Мы змаглі прыняць шэраг эфектыўных мер па прадухіленню масавага беспрацоўя ў горадзе. На 1 красавіка 1993 г. у Мінску ў службе занятасці на ўліку стаяла 8898 беспрацоўных, праз дзяржаўную службу занятасці насельніцтва ў 1992 г. працаўладкаваны 7003 чалавекі.

Арганізавана перападрыхтоўка вызваляемых у выніку скарачэння работнікаў па іншых спецыяльнасцях з наступным працаўладкаваннем на прадпрыемствах і ў арганізацыях горада, дзе патрабуюцца рабочыя рукі.

У снежні мінулага года выканкам гарсавета зацвердзіў «Праграму садзейнічання занятасці і сацыяльнай абароны насельніцтва Мінска на 1993 год». Яна ў значнай ступені ўлічвае праблемы занятасці ва ўвязцы з развіццём эканомікі.

Першачарговая ўвага выканкама, камітэта адукацыі, культуры, спорту і па справах моладзі была сканцэнтравана на развіцці адукацыйнага і культурнага патэнцыялу горада, нашы дзеці будуць жыць зусім у іншых сацыяльна-эканамічных умовах, і рыхтаваць іх да гэтага трэба сягоння.

Сягоння ў 128 рэальных класах займаецца больш 2,5 тыс. школьнікаў. Апрача гэтага, на спецыяльна створаных участках у міжшкольных НПК працуюць больш 500 падлеткаў, якія раней не былі заняты на вытворчасці і не вучыліся ў школе. Усё гэта дазволіла ў значнай ступені сацыяльна абараніць моладзь, некалькі знізіць вастрыню праблемы працаўладкавання. Адначасова па заяўках службы занятасці пачата падрыхтоўка і перападрыхтоўка кадраў у трох ПТВ горада (№№ 13,40, 43). У мінулым годзе ўдалося ажыццявіць станаўленне зноў створаных структур гарадской інспекцыі адукацыі, гарадскога метадычнага цэнтра і службаў арганізатараў адукацыі ў РАНА і ГУНА, што дазволіла павысіць прафесіянальны ўзровень упраўленчай дзейнасці, ліквідаваць дубліраванне ва ўсіх звеннях кіравання.

Шэраг мер прыняты па рэалізацыі Закона аб мовах. З апярэджваннем гарадской праграмы ідзе перавод навучальных устаноў на беларускую мову навучання. У 1992 г. у дапаўненне да дзеючых адкрыты 44 беларускія агульнаадукацыйныя школы (іх агульны лік сёння складае 84) і 128 першых беларускамоўных класаў у рускамоўных школах. У б.г. атрымаюць адукацыю на беларускай мове 48,3% навучэнцаў 1-ых класаў (у мінулым годзе — 19%). За праведзеную работу ў гэтым напрамку мне б хацелася выказаць асабістую падзяку.

У структуры гарадскога Палаца дзяцей і моладзі ўдалося стварыць адзіную ў рэспубліцы службу па рабоце з таленавітымі дзецьмі.

У 1992 г. гарсавет і гарвыканкам удзялілі шмат увагі праблеме школьнага харчавання. Праектам бюджэту на 1993 год на бясплатныя школьныя экспрэс-снеданні выдзелена больш 1 млрд. руб.

У выніку прынятых рашэнняў і пазіцый гарвыканкама ўдалося прыпыніць працэс разбазарвання ведамасных дашкольных устаноў, але па стану на красавік 1993 г. 24 ведамасныя дашкольныя ўстановы закрыты на капрамонт і ў большасці выпадкаў намер ведамстваў па іх лёсу не выклікае сумненняў.

Усяго ў горадзе працуюць 223 школы ўсіх тыпаў з ахопам навучэнцаў 243,4 тысячы. Адкрыты 10 гімназій, 3 ліцэі, 1 каледж. У 29 ПТВ займаюцца 20 тыс. навучэнцаў, працуюць 2 педвучылішчы, 11 НПК, 232 дашкольныя ўстановы, 3 дзіцячыя дамы, 39 пазашкольных устаноў.

У 1993 г. на першы план у дзейнасці ўстаноў народнай адукацыі выходзяць задачы выхавання дзяцей, ломкі ўстарэлых стэрэатыпаў, стварэнне неабходных умоў развіцця асобы кожнага дзіцяці.

На працягу 1992 г. з гарадскога бюджэту былі выдзелены фінансавыя сродкі на ўтрыманне аб'ектаў культуры, сярод якіх Цэнтральны дзіцячы парк імя М.Горкага.

КУЛЬТУРА

Створаны 2 культурныя фарміраванні — Мінскі драматычны тэатр «Дзе-я» і гарадскі цэнтр адраджэння і развіцця беларускай культуры. Завяршаецца рэканструкцыя будынка Дзяржаўнага маладзёжнага тэатра. Уведзены ў дзеянне 3 памяшканні гарадскіх бібліятэк, адкрыта першая дзіцячая харэаграфічная школа, у новы будынак пераехала дзіцячая школа мастацтваў. Усяго за мінулы год у сферу культуры было накіравана каля 214 млн.рублёў.

Хачу адзначыць, што выканкам ніколі не трымаўся ўбаку ад пытанняў творчых саюзаў і сягоння ўважліва адносіцца да іх праблем, што асабліва датычыцца падтрымкі матэрыяльнага характару.

Разам з тым, Мінгарвыканкам сур'ёзна заклапочаны скарачэннем сеткі ўстаноў культуры горада, фінансуемых за кошт сродкаў прафсаюзных камітэтаў прадпрыемстваў і арганізацый. Так, у сучасны момант колькасць клубных устаноў усіх ведамстваў скарацілася на 9 адзінак. Спынілі сваю дзейнасць Дом культуры будтрэста № 1, клуб МВА імя Кірава, клубы гадзіннікавага завода, маторнага, эксперыментальна-фурнітурнага і іншых прадпрыемстваў. З-за нястачы сродкаў для ўтрымання клубных будынкаў многія кіраўнікі Палацаў і Дамоў культуры вымушаны здаваць у арэнду свае памяшканні розным камерцыйным структурам. А гэта, у сваю чаргу, цягне за сабой значнае скарачэнне калектываў мастацкай самадзейнасці, аматарскіх аб'яднанняў, падлеткавых клубаў.

Зразумела, што неабходна мяняць старыя, надуманыя формы работы культасветустаноў. Але разбураць храмы культуры і мастацтва нельга, бо гэта можа прывесці да бездухоўнасці людзей.

З сацыяльна-эканамічным станам грамадства цесна звязаны **фізкультура і спорт.** Эканамічная нестабільнасць, дэфіцыт бюджэту, недасканальнасць падатковай палітыкі паставілі гэтыя галіны ў вельмі цяжкае становішча.

Не можа не выклікаць нараканняў цяжкі стан матэрыяльнай базы плавальных басейнаў, тэнісных кортаў, трэнажорзалаў з міні-басейнамі і міні-басейнаў у дзіцячых дашкольных установах. А такія буйныя жылыя мікраёны, як «Паўднёвы Захад», «Чыжоўка», «Малінаўка», «Захад» фактычна не маюць спортбудаванняў, апрача школьных. Пры гэтым нават прадугледжанае мэтавай праграмай «Здароўе» будаўніцтва шэрагу фізкультурна-аздараўленчых аб'ектаў так і не распачата, напрыклад, на аўтамабільным і падшыпнікавым заводах, у эканамічным універсітэце, а ў шэрагу выпадкаў прыпынена (ВА «Мінсклегаўтатранс», ВА «Гарызонт»). Нягледзячы на велізарны дэфіцыт бюджэтных сродкаў, гарсавет уключыў у план 1993 г. будаўніцтва 3-х басейнаў. Што і казаць — мала. Але, думаю, не апошняя слова сказалі прамыслоўцы і прадпрымальнікі.

У гэтым годзе гарспарткамітэту, райвыканкамам неабходна шукаць шляхі ўзаемадзеяння з гаспадарчымі кіраўнікамі па далейшаму развіццю спартыўна-масавай і фізкультурна-аздараўленчай работы ў працоўных калектывах.

Сур'ёзную заклапочанасць выклікае злачыннасць непаўналетніх. У 1992 г. імі здзейснена 1729 злачынстваў, што на 32,2% больш, чым у 1991 г. Важным фактарам, які адмоўна ўплывае на рост злачыннасці, з'яўляецца працэс зварочвання выхаваўча-прафілактычнай работы з боку дзяржустаноў і арганізацый, што займаюцца пытаннямі дзяцей, падлеткаў і моладзі.

У прафілактычнай рабоце з непаўналетнімі маецца шэраг недахопаў.

Няма адпаведнага ўзаемадзеяння паміж службамі, прафілактыка групавой і рэцыдыўнай злачыннасці не носіць апераджальнага характару. Вострай з'яўляецца праблема замацавання кадраў у інспекцыях па справах непаўналетніх, што ў значнай ступені адбіваецца на прафесіянальным узроўні і эфектыўнасці работы гэтай службы.

Па-ранейшаму многа пытанняў звязана з работай народных судоў горада па выкарыстанню мер судовай прафілактыкі злачынстваў непаўналетніх. За апошнія 5 гадоў доля непаўналетніх, да якіх судамі былі прыменены меры крымінальнага пакарання ў выглядзе пазбаўлення волі, практычна застаецца нязменнай і вагаецца ў межах 24-29% ад агульнай колькасці асуджаных.

Лічу, што камітэту Сасноўскага разам з райвыканкамі і праваахоўнымі органамі трэба больш актыўна і канкрэтна працаваць у гэтым напрамку.

(Заканчэнне на 3-й старонцы)

РЭЛІГІЯ

Працягваюць развівацца кантакты гарвыканкама з рэлігійнымі канфесіямі і арганізацыямі. За два апошнія гады гарвыканкам зарэгістраваў статуты 35 рэлігійных таварыстваў, якія прадстаўлялі 12 канфесій, у тым ліку 20 — нанаваствораных.

Па прапановах і ў цесным узаемадзеянні з гарвыканкамам многія рэлігійныя абшчыны ажыццяўляюць вялікую дабрачынную і міласэрную работу. Група вернікаў Свята-Духава кафедральнага сабора і Свята-Аляксандра Неўскай царквы абслугоўваюць хворых 2-й і 5-й бальніц, група хрысціян веры евангельскай наведвае дом-інтэрнат для інвалідаў па вул.Ваупшасава, 33 і 9-ую бальніцу. Евангельскія хрысціяне-баптысты абслугоўваюць хворых анкалагічнага аддзялення Мінскай абласной бальніцы. Абшчыны хрысціян веры евангельскай абслугоўваюць хворых уралагічнага аддзялення 4-й бальніцы, а таксама хворых 2-й Савецкай бальніцы.

У гарвыканкаме і райвыканкамах абшчыны знаходзяць разуменне і падтрымку, але сур'ёзныя праблемы ўзнікаюць з-за таго, што толькі 11 з 35 зарэгістраваных таварыстваў маюць свае культавыя будынкі.

Прасцей вырашаецца пытанне з нанаваствoранымі таварыствамі. Па іх просьбах Мінгарвыканкам адводзіць у горадзе зямельныя ўчасткі для будаўніцтва культавых будынкаў. Значна горшыя справы з вяртаннем вернікам былых культавых будынкаў, што захаваліся. Усе такія будынкі знаходзяцца на балансе розных дзяржаўных і грамадскіх арганізацый, якія, нягледзячы на тое, што Пастановай Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь «Аб свабодзе веравызнанняў і рэлігійных арганізацый» прадугледжана перадача рэлігійным арганізацыям ва ўласнасць ці бясплатнае карыстанне царкоўных будынкаў, не спяшаюцца ці ўвогуле не збіраюцца гэта рабіць, стараюцца перакласці свае канфлікты з вернікамі на плечы гарвыканкама, вырашыць за наш кошт свае праблемы.

Такая сягоння сітуацыя з былымі касцёламі на пл.Свабоды, 9, Залатой Горцы, па шэрагу будынкаў, якія належалі раней праваслаўнай Епархіі. Гарвыканкам не пазбягае гэтых пытанняў, шукае шляхі вырашэння з усімі зацікаўленымі бакамі.

Цяжкасці пераходнага перыяду, нестабільнасць сацыяльна-эканамічных і палітычных абставін не маглі не адбіцца на стане правапарадку ў горадзе.

РАБОТА ПРАВААХОЎНЫХ ОРГАНАЎ

Агульная злачыннасць павялічылася ў 1992 г. на 32%.

Напружанасць сітуацыі патрабавала максімальнай мабілізацыі ўсіх сіл і сродкаў органаў унутраных спраў горада. Працуючы ва ўмовах узрослай нагрузкі, супрацоўнікі міліцыі здолелі арганізаваць работу па папярэджванню і раскрыццю злачынстваў. Праведзена больш 600 агульнагарадскіх прафілактычных рэйдаў і спецрэйдаў, расследавана 16 тыс. злачынстваў. У 2 разы больш у параўнанні з 1991 г. раскрыта разбояў, згвалтаванняў, кватэрных краж, больш актыўна раскрываліся грабяжы, крадзяжы, забойствы.

У 1992 г. за кошт бюджэту горада дадаткова ўведзены 52 пасады, а ўсяго за кошт сродкаў горада сягоння ўтрымліваецца амаль 800 супрацоўнікаў міліцыі і 82 адзінкі службовага аўтамотатранспарту. Актыўна дапамагаюць сваім аддзелам міліцыі ў гэтым плане выканкамы Заводскага, Першамайскага, Фрунзенскага, Цэнтральнага раённых Саветаў народных дэпутатаў: толькі ў мінулым годзе імі адшуканы сродкі на ўтрыманне 96 пасад. Добрую ініцыятыву праявіла кіраўніцтва МАЗа, якое за кошт сродкаў прадпрыемства, на дагаворнай аснове з Заводскім РАУС, стварыла спецпадраздзяленне з 33 міліцыянераў, якое забяспечвае правапарадак непасрэдна на тэрыторыі завода. У мінулым годзе супрацоўнікамі гэтага падраздзялення вернута прадпрыемству каштоўнасцей на суму амаль 15,5 млн.руб., у той час як патрачана на іх утрыманне толькі 1,5 млн.руб. Эфектыўнасць работы супрацоўнікаў міліцыі гэтага падраздзялення значна вышэй, чым ведамаснай аховы, работнікі якой часта баяцца пагроз у іх адрас, а некаторыя дык і самі ўступаюць у злачынную змову з раскрадальнікамі. Пачынанне аўтазаводцаў падтрымаў гарвыканкам, яго пераняло кіраўніцтва МТЗ, якое ўжо ў гэтым годзе падпісала дагавор аб стварэнні на заводзе аналагічнага падраздзялення міліцыі ў колькасці 9 чалавек. Гэты вопыт трэба распаўсюджваць. Жыхары Мінска толькі «дзякуй» скажуць нам за гэта.

У б.г. штатная колькасць міліцыі павялічана яшчэ на 400 адзінак, для чаго з бюджэту выдзелена 500 млн.руб., за кошт гарадскога бюджэту набываецца дадаткова 45 адзінак аўтатранспарту.

УУС Мінгарвыканкама мэтанакіравана шукае і выкарыстоўвае новыя формы работы па стабілізацыі аператыўных абставін у горадзе. Зроблена ў гэтым плане толькі за апошнія 2 гады нямала.

З мэтай прыбліжэння міліцыі да насельніцтва ў буйных жылых масівах і на Камароўскім рынку створана 8 гарадскіх аддзяленняў міліцыі. Па ініцыятыве УУС толькі ў 1991-1993 гг. Мінгарсаветам прынята 5 важных рашэнняў, накіраваных на ўзмацненне барацьбы са злачыннасцю з боку асоб паўднёвых рэгіёнаў былога Саюза — аб актуальнасці гэтага пытання добра вядома ўсім дэпутатам. Распрацавана і амаль кожны месяц праводзіцца ў горадзе сацыяльная аперацыя па папярэджанню злачынстваў з боку гэтай катэгорыі асоб. Вынікі ўражваюць і толькі за 2 дні такой аперацыі з 20 па 21 красавіка б.г. за парушэнні рашэння гарсавета № 127 ад 25 сакавіка б.г. за ўхіленне ад рэгістрацыі грамадзян, якія пастаянна пражываюць у іншых рэспубліках СНД, да адміністрацыйнай адказнасці прыцягнута 207 чалавек, якія аштрафаваны на суму больш 1,5 млн.рублёў.

Сягоння ў УУР, УУС і некаторых РАУС створаны цэнтры камп'ютэрызацыі, у якіх сканцэнтравана інфармацыя аб усіх украдзеных рэчах, вышуковыя картатэкі, усе 140 тыс.адзінак аўтатранспарту горада.

У ліпені 1992 г. у структуры УУС сфарміраваны аддзел па барацьбе з арганізаванай злачыннасцю. За гэты кароткі час невялікая па колькасці новая служба сумела ўжо выявіць 30 небяспечных злачынстваў, якія ўчынены арганізаванымі групамі, за 2 месяца б.г. — 15, у тым ліку 12 групавых. У іх ліку вымагальніцтва, разбойныя нападзенні, грабяжы. Канфіскавана вялікая колькасць зброі, якая ўжо ніколі больш не будзе прыменена супраць сумленных людзей.

Аднак было б перабольшваннем лічыць, што ўсе праблемы, звязаныя з работай праваахоўных органаў выканкама, вырашаюцца паспяхова.

Не вырашаны многія пытанні забеспячэння нармальных умоў работы асабовага саставу міліцыі. Сягоння з 9 будынкаў райаддзелаў толькі адзін Заводскі адпавядае нормам.

Пры ўсіх цяжкасцях і складанасцях, аб якіх усе мы ведаем, адпаведныя службы гарвыканкама павінны больш актыўна займацца гэтым пытаннем. Ды і раённым выканкамам нельга адыходзіць ад гэтых праблем, адшукваць і свае магчымасці ўздзейнічаць на паляпшэнне ўмоў працы падпарадкаваных аддзелаў міліцыі.

Яшчэ аб адным хацелася б сказаць. Сягоння, па сутнасці, многія працоўныя калектывы самаўхіліліся ад работы па ахове грамадскага парадку. Дастаткова сказаць, што ў 1992 годзе самаліквідавалася 207 ДНД у колькасці больш чым 12 тыс.дружыннікаў. Спынілі сваё існаванне 161 савет прафілактыкі працоўных калектываў, 190 таварыскіх судоў, 140 камісій па барацьбе з п'янствам. Невыпадкова ў параўнанні з 1989 г. удзел грамадскасці ў раскрыцці злачынстваў скараціўся ў 4 разы, а дружыннікаў — больш чым у 6 разоў. Асобныя працоўныя калектывы не толькі адмовіліся ад удзелу ў барацьбе са злачыннасцю, але і перасталі рэагаваць на паведамленні міліцыі аб адміністрацыйных правапарушэннях, якія ўчынены іх работнікамі.

У 1992 годзе кожнае 4-е паведамленне міліцыі засталося без усялякага разгляду і рэагавання. Асабліва дрэнна вырашаецца гэтае пытанне ў Цэнтральным раёне. З 4127 інфармацый, накіраваных у працоўныя калектывы ўказанага раёна, атрымана толькі 959 адказаў, або менш адной трэці. Нямногім лепшае становішча ў Фрунзенскім, Першамайскім і Партызанскім раёнах.

Райвыканкамам патрэбна прааналізаваць удзел працоўных калектываў у ахове грамадскага парадку, узровень рэагавання гаспадарчых кіраўнікоў на паведамленне праваахоўных органаў аб правапарушэннях і навесці парадак у гэтай справе.

Адным з накірункаў у дзейнасці выканкама Мінскага гарадскога Савета народных дэпутатаў з'яўляецца работа са зваротамі грамадзян. За апошні час выканкам гарсавета ажыццявіў шэраг арганізацыйных і практычных мер, накіраваных на далейшае ўдасканаленне формаў і метадаў работы са зваротамі грамадзян.

У мэтах умацавання сувязей з насельніцтвам горада прэс-цэнтрам выканкама рэгулярна праводзяцца прэс-канферэнцыі з удзелам кіраўнікоў выканкама, яго ўпраўленняў і аддзелаў. Вынікі праведзеных прэс-канферэнцый атрымліваюць сваё адлюстраванне ў газетах «Добры вечар», «Вечерний Минск», «Рэспубліка», «Минский меридиан».

У ліпені 1992 года праведзена сустрэча кіраўнікоў гарвыканкама ў прамым тэлевізійным эфіры з жыхарамі горада.

Вынікі работы са зваротамі грамадзян за паўгоддзе і год разглядаюцца на пасяджэннях выканкамаў гарвыканкама. 25 мая 1992 года пытанне аб рабоце выканкама Мінскага гарадскога Савета народных дэпутатаў са зваротамі грамадзян разглядалася на пасяджэнні Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь. У мэтах ліквідацыі адзначаных недахопаў выканкамам гарсавета, яго аддзеламі і ўпраўленнямі былі распрацаваны мерапрыемствы. Рэалізацыя іх дазволіла ў некаторай ступені ліквідаваць асобныя прычыны, якія выклікаюць скаргі ў грамадзян.

Прымаліся меры па ўзмацненню кантролю за своечасовасцю і аб'ектыўнасцю разгляду зваротаў грамадзян у адрас выканкама гарсавета.

У мэтах ліквідацыі прычын, што выклікаюць скаргі грамадзян, працягвалася работа па сацыяльнай ахове інвалідаў, малазабяспечаных і іншых катэгорый грамадзян, для якіх выдзяляліся дадатковыя грошы з пазабюджэтных сродкаў на бясплатныя абеды і падпіску на перыядычны друк.

У ходзе падрыхтоўкі жылога фонду да зімы выкананы вялікі аб'ём рамонтных работ, што таксама прывяло да скарачэння скаргаў грамадзян па гэтых пытаннях.

Аналіз зваротаў грамадзян за апошнія 2 гады сведчыць аб тэндэнцыі да іх скарачэння, у т.л. і праз вышэйстаячыя органы. У 1992 г. у выканкам гарсавета паступіла 5896 пісьмовых і 2298 вусных зваротаў грамадзян, што адпаведна на 24,3% і на 7,7% менш у параўнанні з 1991 г. У І квартале б.г. таксама працягвае скарачацца колькасць зваротаў грамадзян па ўсіх напрамках дзейнасці. Але ў гэтай рабоце ў нас яшчэ шмат валакіты, нядобрасумленных адносін да людскіх праблем.

Выканкам гарсавета ў справаздачны перыяд працаваў над рэалізацыяй канцэпцыі сваёй новай структуры, зацверджанай VI сесіяй гарсавета. За мінулы год, як вы ведаеце, мы дапрацавалі і зацвердзілі структуру і палажэнні аб камітэтах, самастойных аддзелах і ўпраўленнях, перайшлі да арганізацыйных пытанняў іх фарміравання.

Базавым у гэтай рабоце стаў камітэт эканомікі. Ён першым, у асноўным, завяршыў арганізацыйнае афармленне. У камітэце вырашаны пытанні фінансавання, адкрыты рахунак, падрыхтаваны пячатка, бланкі, адпрацавана арганізацыйная структура, падрыхтавана і зацверджана на выканкаме палажэнне аб калегіі камітэта і яе састаў.

Згодна з новай структурай ідзе фарміраванне структурных падраздзяленняў іншых камітэтаў, рыхтуецца неабходная дакументацыя.

Разам з тым пераход да новай структуры стрымліваецца неадрэгуляванымі пытаннямі заработнай платы работнікаў камітэтаў.

У адпаведнасці з нарматывамі і патрабаваннямі Дзяржкампрацы работнікі камітэта павінны атрымліваць меншую заработную плату, чым работнікі выканкама пры роўнай кваліфікацыі.

Па шматлікіх зваротах гарвыканкама выключэнне з боку Саўміна і Дзяржкампрацы ў гэтым пытанні зроблена некалькі дзён таму назад.

Мы будзем дабівацца распаўсюджвання гэтага палажэння і на іншыя камітэты. Пытанне зараз на прапрацоўцы ў Савеце Міністраў. Пры задавальняючым яго вырашэнні работа па арганізацыйнаму афармленню камітэтаў будзе працягнута.

(Друкуецца са скарачэннямі)

● СПАРТЫЎНЫ МЕРЫДЫЯН

ГАНОВЕР: ВЫЗНАЧЫЛІСЯ ІНВАЛІДЫ-КАЛЯСАЧНІКІ, МАРАФОНЦЫ ЗАСТАЛІСЯ Ў ЦЕНІ...

СТАНІСЛАЎ СІМАНЬКОЎ, сябра РСПК звышмарафона «Радзіма».

І зноў мы, бегуны-«дальнабойшчыкі», у Гановеры. На гэты раз, як і ў мінулым годзе, гэты гасцінны горад сустрэў беларускіх марафонцаў цёплым вясновым надвор'ем.

Паездка была не з лёгкіх. І калі першы аўтобус прыбыў сюды за дзень да старту, і спартсмены змаглі трохі адпачыць, то другая машына, дзе ў асноўным знаходзіліся нашы больш моцныя бегуны, ледзь паспела да пачатку спаборніцтваў. Прыехаўшы ў тры гадзіны ночы, правёўшы перад гэтым яшчэ адну ноч у аўтобусе, яны не здолелі як след аднавіць сілы. І пераход «з карабля на баль» адбіўся на выніках беларускай каманды на IV-ым Гановерскім ДВ-марафоне.

Адразу ж патрэбна расшыфраваць чытачам абрэвіятуру «ДВ», якая стаіць перад словам «марафон». «ДВ» азначае Deutsche Bundesbahn — аб'яднанне нямецкіх чыгунак. Кожны год пры самым цесным яго ўдзеле праводзіцца серыя марафонаў: вясна — Гановер і Мюнхен, лета — Лейпцыг, восень — Франкфурт-на-Майне. Яны звязаны адзін з адным. І пераможца вызначаецца па лепшаму сумарнаму выніку трох марафонаў. А ўдзельнікі (з Германіі), якія занялі месцы ў першай 1000 на адным з марафонаў, на наступны марафон едуць бясплатна па чыгунцы за кошт аб'яднання ДВ. Вось так дзяржава і адзін з яе прадстаўнікоў — нямецкія чыгункі стымулююць развіццё народнага спорту.

Дарэчы, гановерскі ДВ-марафон — самы малады з гэтай серыі. Ён праводзіцца першым, вясной, перад мюнхенскім ДВ-марафонам, ён як бы адчыняе гэты ланцужок ДВ-марафонаў.

Папулярнасць яго расце з году ў год. І калі ў 1993 годзе ў марафоне прынялі ўдзел каля 2700 спартсменаў, то сёлета ўжо 4419 марафонцаў выйшлі на старт, устанавіўшы тым самым рэкорд колькасці ўдзельнікаў марафона. А яшчэ былі тут дыстанцыі для пачынаючых — 2,1 км і 5 км. І агульная колькасць удзельнікаў з больш чым 40 краін дасягнула амаль 6000 чалавек. На трасе марафона і кропках харчавання працавала каля 500 паліцэйскіх, 250 урачоў, медсясцёр і масажыстаў, якія мелі болей чым 1200 добраахвотных кваліфікаваных памочнікаў. Вось такое яно не простае спартыўнае мерапрыемства — масавы марафонскі прабег, калі да яго ставяцца ўсур'ёз! І яшчэ адна лічба. Мужных бегуноў на дыстанцыі віталі 100 000 гледачоў і балельшчыкаў.

Старт марафона, як і ў 1992 годзе, даў знакаміты алімпійскі чэмпіён па марафону ў 1952 годзе чэх Эміль Затапек. Першымі адправіліся на дыстанцыю інваліды-калясачнікі, сярод якіх былі і трое прадстаўнікоў Беларускага таварыства інвалідаў: Іван Кацегаў, Павел Дзенісевіч і Валерый Румянцаў. Неўзабаве за імі рушыла ў нялёгкую дарогу асноўная група марафонцаў, разбітая на дзве плыні, якія потым зліліся ў адну шырокую раку. Да самага фінішу яна прабівала сабе шлях скрозь шэрагі балельшчыкаў, жыхароў горада, што шчыльна з абодвух бакоў абступілі спартыўную трасу.

Абсалютным пераможцам IV-га Гановерскага ДВ-марафона стаў прадстаўнік гаспадароў, нямецкі спартсмен Курт Сцэнцэль з Дортмунда, які паказаў вынік 2 гадзіны 13 хвілін 25 секунд. Усяго 22 секунды не дацягнуў ён да рэкорда трасы, які быў тут устаноўлены ў 1992 годзе нашым земляком, мінчуком Сяргеем Сокавым. Ва ўзнагароду К.Сцэнцэль атрымаў 4500 DM. Сярод жанчын таксама перамагла 24-гадовая немка Брыжыт Ершабек з вынікам 2:30.34. Трэцяй на гэтай дыстанцыі была маскоўская бягуння Алена Сіпатава з вынікам 2:38.25.

Сярод інвалідаў-калясачнікаў на другім і трэцім абсалютных месцах былі нашы — бярэзінец Іван Кацегаў і мінчук Павел Дзенісевіч, якія ўступілі першае месца нарвежцу Свену Лавасу. Нядрэнны падарунак Беларускаму таварыству інвалідаў, што камандзіравала іх на гэтае міжнароднае спартыўнае свята!

Сярод беларускіх марафонцаў лепшымі былі Сяргей Давыдзька (2: 23.17, 25-ае месца), Уладзімір Танчынскі (2:25.13, 37-ае месца) і Алег Быкаў (2:29.57, 75-ае месца), якія стартавалі пасля дзвюх паўбяссонных начэй, праведзеных у крэсле аўтобуса.

З нашых жанчын лепей іншых выступіла мінчанка Людміла Агеева, інжынер-канструктар з ВА «Гарызонт», адолеўшая першую ў сваім жыцці марафонскую дыстанцыю за 3 гадзіны 46 мін. 26 сек. Яна і заняла 23-ае месца ў сваёй узроставай групе. Сціпласці і працавітасці гэтай саракашасцігадовай жанчыны можна толькі пазайздросціць. Усяго толькі 2 секунды ўступіла ёй Ларыса Леўчанка, трэнер-настаўнік, якая заняла 28-ае месца ў групе да 30 год.

Трэба адзначыць і выступленне Юрыя Буранова, трэнера нашых інвалідаў-калясачнікаў, выканаўчага дырэктара Беларускай федэрацыі фізічнай культуры і спорту інвалідаў, які выступіў на дыстанцыі 2,1 км, дзе паказаў таксама лепшы вынік у сваёй узроставай групе.

